Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА БІБЛІЯТЭК

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11 -01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 01 Маркетынг бібліятэчнай справы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнік**

*Ю. М. Галкоўская,* старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*Л. А. Аўгуль,* загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;

*Н. А. Ляйко,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 22.03.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *Ю. М. Галкоўская*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Навукова-метадычная работа бібліятэк» з’яўляецца неабходнай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Актуальнасць вывучэння гэтай дысцыпліны абумоўлена прафесіяналізацыяй кіраўнічай дзейнасці бібліятэк. Навукова абгрунтаваная метадычная работа адыгрывае значную ролю ў арганізацыі выканання бібліятэкамі іх сацыяльных функцый, яна з’яўляецца аб’ектыўнай умовай удасканалення дзейнасці бібліятэк, іх развіцця.

Дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі студэнтамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні абавязковых дысцыплін агульнапрафесійнага цыкла – «Бібліятэказнаўства», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія» і абавязковых спецыяльных дысцыплін: «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «Інфармацыйны рынак і яго прававое забеспячэнне» і інш. У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні гэтага курса, з’яўляюцца асновай для засваення матэрыялу асобных дысцыплін спецыялізацыі «Маркетынг бібліятэчнай справы», у прыватнасці такіх, як «Фінансава-эканамічная дзейнасць», «Кіраванне персаналам бібліятэкі».

*Мэтай* вывучэння дысцыпліны «Навукова-метадычная работа бібліятэк» з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў устойлівых ведаў, якія датычацца сутнасці навукова-метадычнай работы як комплекснага кірунку дзейнасці, які аказвае непасрэднае ўздзеянне на арганізацыю работы бібліятэкі як цэласнай сістэмы; садзейнічанне фарміраванню прафесійных арганізацыйна-кіраўнічых кампетэнцый (метадычнай, прававой, сацыяльна-праектнай і інш.) будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў і ўменняў. *Задачы* вывучэння дысцыпліны:

– фарміраванне ў студэнтаў на аснове міждысцыплінарнага падыходу сістэмных ведаў аб сутнасці навукова-метадычнай работы, яе асноўных напрамках; ролі аналітычнай дзейнасці і дзейнасці па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту ў мета-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк; сутнасці бібліятэчнай статыстыкі як навуковай дысцыпліны і як галіны навукова-практычнай дзейнасці, накіраванай на збор, групоўку і аналіз статыстычных даных з мэтай давядзення да органаў кіравання поўнай і дакладнай статыстычнай інфармацыі аб дзейнасці бібліятэк; асноўных статыстычных паказчыках; паказчыках афіцыйнай бібліятэчнай статыстыкі; аб кансультатыўнай рабоце метадычных цэнтраў як форме метадычнай дапамогі бібліятэкам; аб асноўных формах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў і інш.;

– фарміраванне ўменняў прымяняць веды, якія тычацца навукова-метадычнай работы бібліятэк: авалоданне методыкай падрыхтоўкі метадычных выданняў, арганізацыйна-распарадчай дакументацыі, методыкамі правядзення метадычнага маніторынгу ў бібліятэках, складання планаў абследаванняў бібліятэк, аказання метадычнай дапамогі бібліятэкам, арганізацыі мерапрыемстваў па павышэнні кваліфікацыі і перападрытоўкі супрацоўнікаў бібліятэк; фарміраванне ўменняў прымяняць веды, якія тычацца збору, разліку адносных і сярэдніх велічынь, групоўкі і зводкі статыстычных даных, ажыццяўлення статыстычнага аналізу; планавання дзейнасці бібліятэк, правядзення кансультацый для супрацоўнікаў бібліятэк па найбольш актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі, ажыццяўлення аналізу і прагназавання дзейнасці бібліятэк;

– фарміраванне ўмення выкарыстоўваць рэгламентуючую дакументацыю ў практычнай дзейнасці бібліятэк;

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

Для набыцця прафесійных кампетэнцый у выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя паняцці, прынцыпы і функцыі метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк;

– гісторыю развіцця метадычных службаў;

– арганізацыйныя формы і структуру метадычнай службы бібліятэкі;

– асноўныя напрамкі навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк;

– структуру і ўзроўні бібліятэчнай статыстыкі;

– нарматыўна-рэгламентуючыя дакументы ў галіне бібліятэчнай статыстыкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– віды і метады разліку асноўных статыстычных паказчыкаў, якія прымяняюцца ў галіне бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь і замежжа;

– праблемы і перспектывы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў;

*умець:*

– праводзіць маніторынг дзейнасці бібліятэкі;

– весці работу па ўдасканаленні бібліятэчных цыклаў і працэсаў;

– ажыццяўляць улік, справаздачнасць і планаванне работы;

– збіраць і аналізаваць справаздачную дакументацыю;

– разлічваць адносныя і сярэднія статыстычныя паказчыкі;

– упарадкоўваць статыстычныя даныя (групаваць, зводзіць, наглядна адлюстроўваць);

– выяўляць асаблівасці, тэндэнцыі і заканамернасці развіцця з'яў і працэсаў бібліятэчнай дзейнасці на падставе статыстычнага аналізу;

– аказваць метадычную дапамогу бібліятэкам;

– распрацоўваць метадычныя дапаможнікі, арганізацыйна-распарадчую дакументацыю;

– складаць планы абследавання бібліятэк;

– распрацоўваць планы арганізацыі мерапрыемстваў па павышэнні кваліфікацыі і перападрытоўцы супрацоўнікаў бібліятэк;

– праводзіць кансультацыі для супрацоўнікаў бібліятэк па найбольш актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі;

– ажыццяўляць аналіз і рабіць прагноз дзейнасці бібліятэк.

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай работы:

– кантралюемая самастойная работа – выкананне заданняў у аўдыторыі ў час правядзення практычных заняткаў пад кантролем выкладчыка ў адпаведнасці з раскладам;

– кіруемая самастойная работа – выкананне індывідуальных (групавых) заданняў у пазааўдыторны час з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Навукова-метадычная работа бібліятэк» усяго прадугледжана 146 гадзін, з якіх 90 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 30, семінары – 20, практычныя заняткі – 40. Вывучэнне курса рэкамендавана завяршаць залікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | практ. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Метадычныя службы бібліятэк** | | | | |
| *Тэма 1.* Гісторыя станаўлення і сучасны стан метадычных службаў бібліятэк | 3 | 1 | 2 | |
| *Тэма 2.* Арганізацыя работы метадычных службаў бібліятэк | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 3.* Метадыст: прафесійныя рысы і структура прафесійнай дзейнасці | 6 | 2 | 2 | 2 |
| **Раздзел II. Сутнасць і асноўныя напрамкі навукова-метадычнай работы бібліятэк** | | | | |
| *Тэма 4.* Навукова-метадычная дзейнасць: асноўныя кірункі, прынцыпы і функцыі | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Метадычны маніторынг. Аналітычная дзейнасць бібліятэк | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Кансультатыўна-метадычная дапамога бібліятэкам | 8 | 2 | 2 | 4 |
| *Тэма 7.* Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў як кірунак навукова-метадычнай дзейнасці | 8 | 2 | | 6 |
| *Тэма 9.* Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел III. Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк** | | | | |
| *Тэма 10.* Роля бібліятэчнай статыстыкі ў навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк | 3 | 2 | 1 | |
| *Тэма 11.* Стандартызацыя бібліятэчнай статыстыкі | 5 | 2 | 1 | 2 |
| *Тэма 12.* Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: збор, разлік, аналіз | 12 | 2 | | 10 |
| *Тэма 13.* Этапы статыстычнага даследавання | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 14.* Упарадкаванне эмпірычных даных: статыстычныя табліцы і графікі | 6 | 2 | | 4 |
| *Тэма 15.* Вымярэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк і бібліятэчная статыстыка. Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці бібліятэк | 6 | 2 | 2 | 2 |
| **Разам…** | 90 | 30 | 20 | 40 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Навукова-метадычная работа бібліятэк». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць курса. Веды, уменні, вопыт, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння курса. Яго ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі прадметамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці курса вучэбна-метадычнай дакументацыяй.

## Раздзел I. Метадычныя службы бібліятэк

### *Тэма 1. Гісторыя станаўлення і сучасны стан метадычных службаў бібліятэк*

Гісторыя стварэння метадычных службаў у бібліятэках: асноўныя этапы, праблемы, сучаснае становішча, перспектывы. Прыярытэты ў дзейнасці метадычных службаў. Навукова-метадычныя цэнтры (галіновыя, рэгіянальныя, акадэмічныя, ВНУ і інш.), іх асноўныя функцыі і задачы.

Змена метадычнага кіраўніцтва метадычным забеспячэннем функцыянавання бібліятэк як галоўная асаблівасць метадычнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця.

Прафесіяналізацыя навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 2. Арганізацыя работы метадычных службаў бібліятэк*

Метадычныя службы бібліятэк, кірункі іх дзейнасці. Метадычны кабінет: спецыфіка фонду і даведачна-пошукавага апарату. Картатэкі метадычнай службы як сродак акумуліравання навукова-метадычнай інфармацыі. Тэхнічныя сродкі метадычнай работы. Улік, справаздачнасць і планаванне метадычнай дзейнасці. Структура метадычных службаў бібліятэкі, размеркаванне абавязкаў паміж метадыстамі. Нарміраванне працы метадыстаў.

Праблемы фарміравання кадраў метадычных службаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Метадыст: прафесійныя рысы і структура прафесійнай дзейнасці*

Прафесія метадыста, яе сутнасць. Асноўныя кваліфікацыйныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да метадыста бібліятэкі. Дзелавыя і асабістыя якасці, якімі павінен валодаць метадыст. Веды і ўменні метадыста. Фактары прафесійнай сталасці метадыста бібліятэкі. Асаблівасці прафесійнага цыкла метадыста, этапы прафесійнага цыкла метадыста.

Структура прафесійнай дзейнасці метадыста: суб'екты, аб'екты, мэты, функцыі, сродкі.

Арганізацыя прафесійнай вучобы метадычных кадраў.

## Раздзел II. Сутнасць і асноўныя напрамкі навукова-метадычнай работы бібліятэк

### *Тэма 4. Навукова-метадычная дзейнасць: асноўныя кірункі, прынцыпы і функцыі*

Метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк, яго сутнасць і задачы. Змест паняцця «метадычная работа». Асноўныя задачы метадычнай работы на сучасным этапе. Узроўні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Асноўныя прынцыпы метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк: навуковасць, актыўнасць, рэкамендацыйнасць, дыферэнцаваны падыход, непасрэдная сувязь з бібліятэкамі, апаратыўнасць, сістэматычнасць і планавасць.

Функцыі метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці: інфармацыйная, педагагічная, арганізацыйная, навукова-даследчая. Узаемасувязь навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння: аналітычная дзейнасць, кансультатыўна-метадычная дзейнасць, дзейнасць па фарміраванні і садзейнічанні засваення бібліятэчных наваўвядзенняў, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў.

Дыскусійныя пытанні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк у сучасных умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Метадычны маніторынг. Аналітычная дзейнасць бібліятэк*

Метадычны маніторынг як сістэма назірання за зменамі ў дзейнасці бібліятэк. Вызначэнне паняцця «метадычны маніторынг». Яго аб’екты і асноўныя крыніцы інфармацыі. Акумуліраванне звестак у сістэме метадычнага маніторынгу. Інфармацыйна-пошукавы апарат метадычнага маніторынгу.

Абследаванне дзейнасці бібліятэк як асноўны метад атрымання інфармацыі для яго наступнага аналізу. Асноўныя метады абследавання бібліятэк: непасрэднае назіранне, вывучэнне дакументаў, гутаркі з бібліятэчнымі супрацоўнікамі і карыстальнікамі, метад анкетнага апытання.

Віды абследавання бібліятэк. Мэты і аб’екты франтальнага і тэматычнага абследаванняў. Этапы правядзення абследавання. Методыка абследавання бібліятэк.

Аналіз бібліятэчнай практыкі: аналіз зместу дзейнасці бібліятэк, аналіз метадаў і вынікаў работы. Колькасны і якасны аналіз, іх асноўныя метады.

Сістэматызацыя фактычнага матэрыялу. Выніковыя дакументы аналітычнай дзейнасці: статыстычныя зводкі, заключэнні па справаздачах і планах бібліятэк, агляды дзейнасці бібліятэк. Методыка складання аглядаў дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне вынікаў аналітычнай дзейнасці ў метадычным забеспячэнні работы бібліятэк.

### *Тэма 6. Кансультатыўна-метадычная дапамога бібліятэкам*

Кансультатыўна-метадычная дапамога бібліятэкарам як адна з традыцыйных форм метадычнай дапамогі. Асноўныя патрабаванні да метадычнага кансультавання. Формы навукова-метадычнага кансультавання.

Падрыхтоўка, выданне і распаўсюджванне метадычных выданняў як асноўны шлях актыўнага кансультатыўна-метадычнага ўздзеяння. Сістэма метадычных выданняў для бібліятэк, асноўныя віды і групы: метадычныя дапаможнікі; інструктыўна-метадычныя дапаможнікі; вучэбна-метадычныя дапаможнікі; інфармацыйныя дапаможнікі; апісанні бібліятэчных нова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвядзенняў; бібліяграфічныя дапаможнікі ў дапамогу бібліятэкару; метадычныя выданні комплекснага характару.

Патрабаванні да зместу і складу метадычных выданняў. Вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання метадычных рэкамендацый і інш.

### *Тэма 7. Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту*

Інавацыйная дзейнасць у бібліятэках, яе сутнасць і змест. Асноўныя этапы інавацыйных працэсаў у бібліятэцы. Інфармацыйнае забеспячэнне інавацыйнай дзейнасці.

Новаўвядзенні, іх выяўленне, вывучэнне і абагульненне. Інфармаванне аб новаўвядзеннях, распаўсюджванне іх па бібліятэках. Кіраванне новаўвядзеннямі ў бібліятэках: стварэнне новаўвядзенняў з дапамогай эксперыментальных метадаў, іх укараненне і дапамога бібліятэкам у засваенні.

### *Тэма 8. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў як кірунак навукова-метадычнай дзейнасці*

Павышэнне кваліфікацыі кадраў бібліятэкі як неабходная ўмова ў сістэме развіцця персаналу. Патрабаванні да сістэмы павышэння кваліфікацыі: усеагульнасць, дыферэнцаваны падыход, развіццё творчай ініцыятывы бібліятэкараў, сістэматычнасць і паслядоўнасць. Асноўныя напрамкі і формы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў: курсы павышэння кваліфікацыі, навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, практыкумы, стажыроўкі.

Інавацыйныя метады і формы навучання ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў. Самаадукацыя як важнейшая форма павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў. Удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі метадыстаў. Інфармацыйнае забеспячэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк*

Прымяненне інфармацыйных тэхналогій пры ажыццяўленні асноўных кірункаў метадычнай работы: у працэсе аналітычнай дзейнасці метадычных цэнтраў і службаў, кансультатыўна-метадычнай дзейнасці, дзейнасці па фарміраванні і садзейнічанні засваення бібліятэчных наваўвядзенняў, у працэсе павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Фактары, якія стрымліваюць прымяненне інфармацыйных тэхналогій у метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк. Перспектывы развіцця метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк у сувязі з прымяненнем новых інфармацыйных тэхналогій.

## Раздзел III. Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк

### *Тэма 10. Роля бібліятэчнай статыстыкі ў навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк*

Бібліятэчная статыстыка: існуючыя пункты гледжання на азначэнне паняцця, шырокае і вузкае разуменне «бібліятэчнай статыстыкі». Аб’ект статыстычнага даследавання ў бібліятэчнай статыстыцы: шырокае і вузкае разуменне. Прадмет бібліятэчнай статыстыкі. Агульная мэта бібліятэчнай статыстыкі, задачы бібліятэчнай статыстыкі.

Структура бібліятэчнай статыстыкі ў шырокім і вузкім сэнсах. Узроўні бібліятэчнай статыстыкі: іх агульная характарыстыка.

Суб’екты, якім патрэбна бібліятэчная статыстыка. Роля бібліятэчнай статыстыкі ў кіраванні бібліятэчнай справай краіны ўвогуле і асобнымі бібліятэкамі ў прыватнасці.

### *Тэма 11. Стандартызацыя бібліятэчнай статыстыкі*

Сутнасць стандартызацыі і яе роля ў галіне бібліятэчнай статыстыкі. Узроўні стандартызацыі бібліятэчнай статыстыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць IFLA і ISO ў галіне ўдасканалення паказчыкаў дзейнасці бібліятэк. Маніфест IFLA аб бібліятэчнай статыстыцы (2010). Асноўныя замежныя стандарты ў галіне бібліятэчнай статыстыкі, у тым ліку стандарт ISO 2789 «Міжнародная бібліятэчная статыстыка» і інш.

Нацыянальны стандарт па бібліятэчнай статыстыцы Рэспублікі Беларусь СТБ 7.20-2000 «Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні»: агульная характарыстыка стандарту.

### *Тэма 12. Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: збор, разлік, аналіз*

Статыстычныя паказчыкі: змест паняцця. Уліковая функцыя статыстычных паказчыкаў. Статыстычны паказчык як колькасная мадэль з’яў ці працэсаў дзейнасці бібліятэк. Статыстычныя паказчыкі і планаванне дзейнасці: роля статыстычных паказчыкаў у кіраванні бібліятэчнай дзейнасцю. Сістэма статыстычных паказчыкаў і яе характэрныя рысы. Адрозненні планавых і ўлікова-статыстычных паказчыкаў.

Асноўныя віды статыстычных паказчыкаў – абсалютныя, адносныя, сярэднія паказчыкі – змест паняццяў і агульная характарыстыка. Сутнасць абсалютных паказчыкаў. Тры асноўныя групы адносных паказчыкаў: паказчыкі дынамікі (каэфіцыент, тэмп росту, тэмп прыросту); паказчыкі структуры; паказчыкі інтэнсіўнасці. Віды сярэдніх паказчыкаў. Прыклады кожнага віду паказчыкаў. Асаблівасці збору і вылічэння гэтых паказчыкаў.

Комплекс паказчыкаў афіцыйнай бібліятэчнай статыстыкі. Форма дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці ў Рэспубліцы Беларусь – форма 1-бібліятэка (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці публічнай бібліятэкі», яе агульная характарыстыка.

### *Тэма 13. Этапы статыстычнага даследавання*

Змест паняцця «статыстычнае даследаванне». Этапы статыстычнага даследавання.

Статыстычнае назіранне: змест паняцця. Галоўная задача статыстычнага назірання. Даныя статыстычнага назірання як складаючая частка кіруючай інфармацыйнай сістэмы бібліятэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кі, патрабаванні да іх. Праграма статыстычнага назірання: агульная характарыстыка. Раздзяленне статыстычных назіранняў па спосабе арганізацыі, па ахопе адзінак сукупнасці, па часе правядзення, па крыніцах звестак. Агульная характарыстыка вылучаных відаў, арганізацыйных форм і спосабаў правядзення статыстычнага даследавання.

Групоўка і зводка матэрыялу: змест паняццяў і агульная характарыстыка. Паслядоўнасць выканання работ над данымі статыстычнага назірання пры групоўцы і зводцы статыстычных даных. Задачы групоўкі даных і адпаведныя задачам віды групоўкі (тыпалагічная, структурная, аналітычная). Зводка як этап упарадкавання і сістэматызацыі статыстычных даных.

Статыстычны аналіз як заключная стадыя статыстычнага даследавання: агульная характарыстыка. Задачы і парадак ажыццяўлення статыстычнага аналізу.

## *Тэма 14. Упарадкаванне эмпірычных даных: статыстычныя табліцы і графікі*

Упарадкаванне эмпірычных даных: сутнасць і прыёмы ўпарадкавання.

Таблічнае прадстаўленне статыстычных даных як сродак упарадкавання эмпірычных даных. Статыстычная табліца: змест паняцця. Патрабаванні да складання і афармлення табліц. Дзейнік і выказнік у табліцы – іх месца ў табліцы. Табліцы па пабудове дзейніка: простыя, групавыя, камбінацыйныя, іх агульная характарыстыка.

Графічнае адлюстраванне эмпірычных даных: сутнасць і прызначэнне. Асноўныя элементы графіка. Класіфікацыя графікаў: па змесце ці прызначэнні; па характары графічнага вобраза; па спосабе пабудовы (дыяграмы, картадыяграмы, картаграмы), агульная характарыстыка. Віды графікаў, якія часцей выкарыстоўваюцца ў бібліятэчнай статыстыцы. Найбольш распаўсюджаныя формы дыяграм: лінейныя, плоскасныя, структурныя. Асноўныя перавагі графічнага адлюстравання ў параўнанні з таблічным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 15. Вымярэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк і бібліятэчная статыстыка. Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці бібліятэк*

Бібліятэчная статыстыка і вымярэнне эфектыўнасці работы: узаемасувязь і адрозненні. Замежны вопыт выкарыстання статыстычных паказчыкаў для ацэнкі эфектыўнасці бібліятэк. Стандарт ISO 11620 «Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк», агульная характарыстыка. Кірункі ўдасканалення паказчыкаў бібліятэчнай статыстыкі ў замежжы. Сутнасць і асноўныя ўласцівасці паказчыкаў эфектыўнасці. Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк, замацаваныя ў нарматыўна-рэгламентуючых дакументах Расійскай Федэрацыі: паказчыкі сацыяльнай, эканамічнай і вытворчай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк.

Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці: Servqual, Libqual, Best Value, Benchmarking і інш. Сутнасць гэтых методык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Авраева, Ю. Б.* Методист библиотеки : формула успеха : науч.-метод. пособие / Ю. Б. Авраева, Э. С. Очирова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – 96 с.

2. *Авраева, Ю. Б.* Методическая деятельность библиотек : традиции и инновации / Ю. Б. Авраева, Э. С. Очирова // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб. – Вып. 2(6) / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – С. 272–286. – (Прил. к журн. «Библиотековедение»).

3. *Басов, С.* Проблемы и перспективы перестройки методической работы : взгляд из 1988 года / С. Басов // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С. 2–7.

4. *Библиотечная* статистика // М. Н. Колесникова. Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : учебник для вузов / М. Н. Колесникова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – С. 137–146.

5. *Библиотечная* статистика // И. М. Суслова. Управленческий учет в библиотеке : библиотечная статистика : современное состояние, проблемы : учеб. пособие для вузов и колледжей культуры / И. М. Суслова, Т. Л. Манилова. – 2-е изд., дораб. и знач. доп. – М. : ИПО «Профиздат» : Изд-во МГУКИ, 2000. – С. 47–75. – (Серия «Современная библиотека»; вып. 6).

6. *Ванеев, А. Н.* Методическое обеспечение библиотечной деятельности : учеб. пособие / А. Н. Ванеев ; СПбГУКИ. – М., 2002. – 140 с. – (Серия «Современная библиотека»; вып. 10).

7. *Ванеев, А. Н.* Проблемы методического мониторинга / А. Н. Ванеев // Библиотечное дело : теория, методика, практика / А. Н. Ванеев. – СПб., 2004. – С. 342–343.

8. *Ванеев, А. Н.* Проблемы перестройки методической деятельности / А. Н. Ванеев // Библиотечное дело : теория, методика, практика / А. Н. Ванеев. – СПб., 2004. – С. 318–330.

9. *Долгополова, Е.* Статистический учет и оценка эффективности обслуживания пользователей / Е. Долгополова // Бібліятэчны свет. – 2008. – № 3. – С. 12–18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Меньщикова, С. П.* Современные критерии и показатели оценки качества библиотечной деятельности : практ. пособие / С. П. Меньщикова. – М. : Литера, 2009. – 93 с.– (Серия «Современная библиотека»; вып. 48).

*11. Методическое* обеспечение библиотечной деятельности // Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 3-е изд., перераб. и доп. – СПб. : Профессия, 2005. – С. 387–402. – (Серия «Библиотека»).

*12. Мотульский, Р. С.* Библиотечная статистика : проблемы и решения / Р. С. Мотульский // Библиотечное дело – XXI век. – 2002. – № 3. – С. 28–64.

*13. Мотульский, Р. С.* Стандартизация библиотечной статистики / Р. С. Мотульский // Библиотечное дело – XXI век. – 2002. – № 3. – С. 91–112.

*14. Научная* и организационно-методическая поддержка инновационной деятельности библиотек // Е. Ю. Качанова. Инновационно-методическая работа библиотек : учеб. пособие / Е. Ю. Качанова ; ХГИИК ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – СПб. : Профессия, 2007. – С. 193–201. – (Серия «Библиотека»).

*15. Ратникова, О. Л.* Организационно-технологические проблемы взаимодействия инновационной и методической деятельности / О. Л. Ратникова // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб. / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – Вып. 2(6). – С. 286–300. – (Прил. к журн. «Библиотековедение»).

*16. СТБ 7.20-2000.* Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні = Библиотечная статистика. Основные положения. – Введ. 01.09.2000. – Мінск : Дзяржстандарт, Б.г. [2000]. – 6 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе).

*17. Сукиасян, Э. Р.* Библиотечная профессия, кадры. Непрерывное образование : сб. ст. и докл. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2004. – С. 190–387. – (Специальный издательский проект для библиотек).

*18. Суслова, И. М.* Методическая работа библиотеки : Перспективные концепции : учеб. пособие / И. М. Суслова. – М. : МГУК, 1995. – 48 с.

*19. Ялышева, В.* Библиотечная статистика. Заметки о современном состоянии / В. Ялышева // Библиотечное дело. – 2007. – № 8. – С. 7–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*20. ISO 11620.* Информация и документация – Показатели эффективности работы библиотек: [Текст] // Режим доступа: http://www.lib.grsu.by/cgi-bin/lib.cgi?menu=doc&path=doc&count=1, свободный. – Загл. с экрана. – Яз. рус. – Дата просмотра: 17.02.2012.

*Дадатковая*

*21. Дворкина, М. Я.* Как долго длится инновация? / М. Я. Дворкина // Библиосфера. – № 4. – 2009. – С. 15–18.

*22. Дергилева, Т. В.* Научно-методическая деятельность центральных библиотек: организация и приоритетные направления : учеб.-метод. пособие / Т. В. Дергилева ; науч. ред. Л. А. Кожевникова ; Гос. публич. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – Новосибирск : ГПНТБ СО РАН, 2007. – С. 40–49.

*23. Дригайло, В. Г.* Основы управления библиотекой высшего учебного заведения : науч.-практ. пособие / В. Г. Дригайло, Е. В. Башун, В. Н. Волынец. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Либерея, 2004. – С. 63–78.

*24. Задерковская, Н. И.* Проблемы статистического учета обслуживания пользователей электронными информационными ресурсами / Н. И. Задерковская // Материалы V Междунар. книговедческих чтений «Электронные библиотеки и ликвидация информационного неравенства», Минск, 8–9 окт. 2009 г. – Минск : НББ, 2009. – С. 91–96.

*25. Кадры* в культуре. Образцы должностных инструкций служащим культурно-просветительных учреждений / сост. Л. И. Липень. – Минск : Дикта, 2009. – 212 с.

*26. Как подготовить* и провести международную конференцию : метод. пособие / ФБ БГУ ; сост. И. Б. Стрелкова, Ю. Л. Деденок ; ред. А. В. Бутина. – Минск, 2005. – 36 с.

*27. Матлина, С. Г.* Публичная библиотека: пути инновационного развития : избранное / С. Г. Матлина. – СПб. : Профессия, 2009. – 390 с.

*28. Межотраслевые* нормы времени на работы, выполняемые в библиотеках // Библиотека и закон. – М., 1997. – Вып. 3. – С. 337–399.

*29. Новожилова, Н. В.* Использование современных информационно-коммуникационных технологий в работе методических центров / Н. В. Новожилова // Методист. – 2005. – № 1. – С. 16–22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*30. Паршукова, Г. Б.* Компьютерные средства в научно-методической работе библиотек / Г. Б. Паршукова // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб. – Вып. 1 (7). – 2004. – С. 139–145.

*31. Паршукова, Г. Б.* Научно-методическая работа библиотекарей на персональном компьютере: учеб.-метод. пособие / Г. Б. Паршукова ; ГПНТБ Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – 2-е изд., перераб. и доп. – Новосибирск : [б. и.], 2003. – 95 с.

*32. Пашин, А. И.* Управление библиотечным делом : системный подход : учеб.-метод. пособие / А. И. Пашин. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – С. 43–50.

*33. Плохотник, Т.* «Бойцы невидимого фронта» : заметки из блокнота / Т. Плохотник // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С. 36–38.

*34. Полл, Р.* Измерение качества деятельности библиотек / Розвитта Пол, Питер те Бокхорст / Российская государственная библиотека ; пер. с англ. [и науч. ред. Г. А. Кисловской]. – Стер. переизд. – М. : Пашков дом, 2010. – 316 с.

*35. Рамазанова, Н.* Корни и крона. Идти впереди каравана / Н. Рамазанова // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С. 42–44.

*36. Цурина, И.* Виртуальная методическая служба. Используем новый ресурс // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С. 39–41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА БІБЛІЯТЭК**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11 -01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 01 Маркетынг бібліятэчнай справы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,73. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ